

# ПЁТР МАШЭРАЎ (1918—1980):

*Пераемнік папярэднікаў*

Пакаленне беларусаў, якое жыло, працавала і дзейнічала, так бы мовіць, пры ім і адначасова з ім, шанавала, даражыла і ганарылася гэтым чалавекам. I не без падстаў на тое... Займаючы вышэйшыя камсамольскія і партыйныя пасады — і на абласным, і на рэспубліканскім узроўнях, Пётр Машэраў перш за ўсё заставаўся чалавекам: даступным для простых людзей, памяркоўным падчас вырашэння складаных, а іншым разам — і супярэчлівых задач і праблем, цвёрдым пры адстойванні сваіх пазіцый... I калі згадаць ды задумацца: шт о гэта быў за час, якая сітуацыя наогул панавала ў Савецкай імперыі, якія «каштоўныя ўказанні» лічы штодзённа зыходзілі з Белакаменнай і г.д., то трэба і насамрэч прызнаць: даніну народнай любві, павагі і прызнання Пётр Міронавіч Машэраў заслужыў!

Пётр Машэраў нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Шыркі Сенненскага раёна на Віцебшчыне. Басаногае маленства, сярэдняя школа... Далей жыццёвая дарога прывяла яго ў Віцебскі педагагічны інстытут, які Машэраў скончыў у 1939-м. Крыху больш двух гадоў ён выкладаў фізіку і матэматыку ў Расонскай сярэдняй школе.

Калі нямецка-фашысцкія захопнікі напалі на нашу краіну, малады настаўнік, якога любіла і паважала мясцовае насельніцтва, ужо ў жніўні 1941-га стварыў і ўзначаліў Расонскае партыйна-камсамольскае падполле. Пятру Міронавічу верылі, да яго слоў прыслухоўваліся, таму мясцовыя жыхары — асабліва юнакі і дзяўчаты, ахвотна давяралі яму свае лёсы, а нярэдка —

і жыцці. Ужо вясной наступнага, 1942 года, масава фарміруюцца партызанскія атрады, і ў адным з іх — імя Шчорса, што дзейнічаў на тэрыторыі Расонскага, Дрысенскага, Асвейскага раёнаў Беларусі, а таксама ў суседніх раёнах Расійскай Федэрацыі і Латвіі, 24-гадовы Машэраў становіцца камандзірам. Адзначу: такіх выпадкаў у гісторыі Вялікай Айчыннай было няшмат.

Партызанскія атрады ў мэтах вядзення больш маштабных і выніковых аперацый супраць акупантаў аб'ядноўваліся ў брыгады, а потым — і ў злучэнні. Менш чым праз год — у сакавіку 1943-га — Машэрава прызначаюць камісарам брыгады імя Ракасоўскага, што дзейнічала там жа, на Віцебшчыне. Неўзабаве з Масквы, з Цэнтральнага штаба партызанскага руху, паступае даручэнне аб стварэнні на акупіраванай ворагам тэрыторыі падпольных партыйных і камсамольскіх камітэтаў, і ў верасні таго ж, 1943-га, Пётр становіцца першым сакратаром Вілейскага падпольнага абкама камсамола. А ў ліпені 1944 года, незадоўга да вызвалення паўночна-заходняй часткі Беларусі, ён становіцца на чале Маладзечанскага АК ЛКСМБ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*